продуктах заинтересованы, и она позволит не только точно планировать объемы продаж, но и вовремя уловить рыночные изменения, которые приведут завтра к формированию новых потребностей клиентов.

1. Граничин, О.Н. Информационные технологии в управлении: учеб. пособие / О.Н. Граничин, В.И. Кияев. – М.: Интернет-Университет информационных ТЕхнологий; БИНОМ. Лаборатория знаний, 2008. – 336 с.

2. Режим доступа: http://www.megatec.ru.

3. Режим доступа: http://www.crmonline.ru/crm/industries/tourism.php.

## ВЫКЛЮЧНЫ ТУРЫЗМ ДЛЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***Шаблыка А.,***
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры,
Рэспубліка Беларусь

Рэспубліка Беларусь не ставіцца да тых дзяржаваў, што атрымліваюць у нацыянальных і тым больш міжнародных маштабах істотны прыбытак ад турызму. Каб тое сталася рэчаісным у цяперашніх беларускіх і сусветных эканамічных умовах, найбольш мэтазгоднай падаецца вузкая турысцкая спецыялізацыя краіны і засяроджанне на такім выглядзе турызму, які з’яўляецца адначасова перспектыўным і дасягальным з эканамічнага і арганізацыйнага гледзішча.

Дзеля вызначэння такога выключнага для Рэспублікі Беларусь выгляду турызму неабходна, найперш, даць належную характарыстыку ўсёй існуючай іхняй разнастайнасці. Паводле мэтаў наведвання вылучаюцца наступныя выгляды турызму: рэкрэацыйны, лекава-аздараўленчы, пазнавальны, спраўны, спартовы, этнічны, рэлігійны, транзітны, адукацыйны [1].

Адсутнасць у Беларусі гор і выйсця да мора адмаўляе існаванне самых масавых і прыбытковых формаў рэкрэацыйнага турызму: гарналыжнага ды пляжнага. Але нават пры магчымасці ажыццяўлення згаданых прыйшлося б выдаткаваць нямала рэсурсаў дзеля прыцягнення ўвагі турыстаў да беларускага прадукту. І справа тут хутчэй не ў адсутнасці адпаведнае інфраструктуры, а ў высокай канкурэнцыі на рынку і ягоным поўным падзеле паміж вядучымі ў гэтым выглядзе турызму краінамі. Нягледзячы на гэтыя акалічнасці, памылкова будзе адмаўляць высокі рэкрэацыйны патэнцыял Рэспублікі Беларусь, паколькі прыродныя рэсурсы краіны маюць усе перадумовы да ўстойлівага і эфектыўнага выкарыстання ў турысцкіх мэтах не толькі ў рэкрэацыі, але і ў любой іншай дзейнасці, якая звязаная з прыродным асяродкам.

Лекава-аздараўленчы, або санаторны, турызм у Беларусі апошнім часам набывае ўсё больш і больш папулярнасці, асабліва сярод турыстаў з Расійскай Федэрацыі. Гэта абумоўлена найперш адносна нізкім коштам паслуг і адсутнасцю візавага рэжыму з суседняй усходняй дзяржавай. Да таго ж лекава-аздараўленчая інфраструктура краіны з’яўялецца дастаткова развітой [2] і напаўняльнасць санатораў ужо знаходзіцца на ўзроўні 90 % пры дзелі замежных турыстаў у 13 –15 %, але ў той жа час 82 % наведвальнікаў айчынных санаторыяў у 2008 г. рабілі гэта за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і фонду сацыяльнага страхавання [3]. Таму далейшае развіццё санаторнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь немагчымае праз адсутнасць патэнцыялу: павелічэнне даходу ад лекава-аздараўленчых паслугаў магчымае ці праз памяншэнне колькасці сацыяльных пуцёвак, што не адпавядае бягучае дзяржаўнае палітыцы, ці праз стварэнне новых санаторных месцаў, што немагчыма ў кароткачасовы перыяд, тым больш без належнага фінансавання.

На тэрыторыі цяперашняе Рэспублікі Беларусь за больш як адзінаццаць стагоддзяў дакументальнай гісторыі краю адбылося багата выбітных і значных падзеяў, якія і ў цяперашні час выклікаюць да сябе інтарэс. Таму няма сумневу, што на Беларусі ёсць усе перадумовы да развіцця пазнавальнага турызму. На жаль, у бліжэйшае будучыні яны будуць заставацца адно нявыкарыстанымі магчымасцямі. Непрыдатная заканадаўчая база, адсутнасць зацікаўленасці ўладаў на ўсіх узроўнях у ахове гісторыка-культурных архітэктурных помнікаў і поўная занядбанасць іхняе большасці зводзяць на нішто нават самыя імпэтныя праекты развіцця пазнавальнага турызму. Праз тое, што больш як дзвесце год на тэрыторыі сённяшняе Беларусі не было ўласнае дзяржаўнасці, адбываўся актыўны вываз рухомых каштоўнасцяў з краіны і нават іхняе знішчэнне. Вынікам гэтага сталася надзвычайная сціпласць музейнага фонду краю з такой працяглай гісторыяй дзяржаўнасці і багатай культурай.

Малая верагоднасць поступу спраўнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь відавочная. Па-першае, на захадзе і паўночным захадзе Беларусь мяжуе з краінамі, дзе інфраструктура для гэтых мэтаў нашмат лепшая; па-другое, цяперашні візавы рэжым Беларусі амаль для ўсіх еўрапейскіх краінаў пры ягонае адсутнасці для грамадзянаў краінаў Шэнгенскага пагаднення ў вышэйзгаданых суседзяў даюць апошнім бясспрэчныя перавагі; па-трэцяе, непрыкметная роля беларускага капіталу ў сусветным бізнесе не здольная звярнуць ўвагі шырокіх эканамічных колаў да краіны.

Увага, якая ў Беларусі надаецца спорту, хоць і мае вялізнае значэнне для прапаганды здаровага ладу жыцця і паляпшэння здароўя нацыі, але недастатковая для прываблівання спартовых турыстаў у сур'ёзных аб'ёмах. У нас ўвогуле не праводзіцца міжнародных чэмпіянатаў па масавых ці прэстыжных відах спорту, якія б матывавалі спартовую супольнасць да наведання краіны. Нельга не заценіць, што турысцкія кампаніі час ад часу атрымліваюць адчувальны для іх прыбытак ад абслугоўвання футбольных фанатаў, якія прыязджаюць у Беларусь з мэтаю падтрымкі сваіх камандаў, але гэтыя грашовыя паступленні істотныя адно толькі на тле невялікіх аб'ёмаў іншых паслугаў. Магчыма, сітуацыя зменіцца ў недалёкае будучыні. У 2014 г. ў Мінску будзе праводзіцца чэмпіянат свету па хакеі з шайбай, які можа стацца выдатным ўзорам атрымання прыбытку ад спартовых турыстаў і стымуляваць далейшае развіццё адпаведнага выгляду турызму ў краіне.

Колькасць беларусаў, якія ў цяперашні час стала знаходзяцца па-за межамі радзімы, ацэньваецца ў 2–2,5 млн чалавек [4], што складае каля 20 % усёй беларускай нацыі і выклікана чыннікамі рознага характару: сацыяльнага, эканамічнага, палітычнага, геапалітычнага і інш. Паводле некаторых звестак, беларусы пражываюць у 73 краінах свету, аднак дакладны падлік іхняе колькасці ў гэтых краінах уяўляецца немагчымым. Гэтаму перашкаджае найперш тое, што шмат у якіх краінах беларусы да пачатку 1990-х гадоў не ўлічваліся ў якасці прадстаўнікоў асобнай нацыі, а да гэтага часу ў XX стагоддзі ўжо адбыліся чатыры вялікія хвалі эміграцыі з Беларусі. Яшчэ адной праблемай уліку беларускіх эмігрантаў з'яўляецца тое, што адбываецца іхняя асіміляцыя тытульнымі нацыямі краінаў пражывання. Нягледзячы на гэта, у этнічным турызме да ўвагі павінныя брацца ўсе рэальныя эмігранты, а таксама іхнія, нават і асіміляваныя, нашчадкі, паколькі падарожжа ў Беларусь можа здзяйсняцца як з мэтаю вяртання на ўласную радзіму, так і наведвання родных мясцінаў продкаў.

Вялікая колькасць этнічных турыстаў, якія маюць усе падставы да прыезду ў Рэспубліку Беларусь, безумоўна, сведчыць на карысць пэўнае перспектыўнасці адпаведнага выгляду турызму для краіны. Але паколькі ўсе патрэбныя для ажыццяўлення этнічнага турызму ўмовы ўжо забяспечаныя, а прытоку такіх турыстаў не назіраецца, то застаецца сведчыць, што чыннікі складзенае сітуацыі не ляжаць на паверхні і на іхняе высвятленне і выкараненне можа быць выдаткавана багата часу і намаганняў.

Што да рэлігійнага турызму, то ў Рэспубліцы Беларусь у цяперашні час існуюць толькі тры больш-менш буйныя цэнтры паломніцтва. Гэта – штогадовы фэст Маці Божай ў мястэчку Будслаў на пачатку ліпеня, у якім удзельнічае да 50 тысячаў паломнікаў [5]; крыж

св. Ефрасінні ў Полацку і Святы крыж у Тураве, якія карыстаюцца меншаю вядомасцю. Натуральна, што гэтага далёка не дастаткова для адчувальнага ўкладу ад абслугоўвання вернікаў у дзяржаўны скарб, хаця колькасць рэлігійных турыстаў і застаецца стабільнай з году ў год.

Транзітны турызм паводле свайго вызначэння не можа з'яўляцца галоўнай перспектывай развіцця турысцкай галіны любое краіны. Турысты выдаткоўваюць у разы большыя грошы па месцы прыбыцця, чым на шляху да яго. Таму варта імкнуцца не да павелічэння аб'ёму транзіту турыстаў праз тэрыторыю краіны, а стымуляваць выбар турыстамі Рэспублікі Беларусь у якасці месца прызначэння і ўдасканальваць адпаведную інфраструктуру разам з належным узроўнем паслугаў.

50 вышэйшых навучальных установаў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюць падрыхтоўку адмыслоўцаў з ліку замежных грамадзянаў. На 1 лістапада 2008 г. ў ВНУ Беларусі на вочным аддзяленні адукацыю атрымлівалі 7537 замежных грамадзянаў, з іх на ўмовах аплаты навучаліся 6965 чалавек, з якіх 59,4 % паходзяць з краінаў Азіі [6]. Кошт навучання ў Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце вагаецца ад 1760 да 2670 даляраў ЗША, у астатніх ВНУ гэтыя рамкі ці ніжэйшыя, ці на тым жа ўзроўні [7]. Экспарт адукацыйных паслугаў складае толькі каля 0,3 % ад агульнага экспарту краіны, але пры гэтым нельга забывацца, што ў дадатак да платы за адукацыю замежныя студэнты выдаткоўваюць сродкі на пражыванне і іншыя патрэбы, якія таксама павялічваюць дзяржаўны скарб Рэспублікі Беларусь. Кепскія перспектывы адукацыйнага турызму тлумачацца найперш праз прызнанне беларускіх дыпломаў аб вышэйшай адукацыі толькі ў чатырох іншых краінах: Кітаі, В'етнаме, Расіі і Польшчы. Істотныя пазітыўныя зрухі ў гэтае вобласці могуць адбыцца адно пасля падпісання двухбаковых дамоваў аб прызнанні дыпломаў з нашмат шырэйшым колам дзяржаваў, што магчыма толькі пры далучэнні Рэспублікі Беларусь да Балонскага працэсу.

З прыведзенае характарыстыкі зразумела, што ўсе згаданыя віды турызму з розных нагодаў з'яўляюцца малаперспектыўнымі для Рэспублікі Беларусь. Але ў дачыненні да прыроднага турызму назіраецца зусім іншая сітуацыя. Адзіным турысцкім рэсурсам, які на цяперашні момант знаходзіцца на Беларусі ў прыдатным да выкарыстання стане, з'яўляецца прыродны асяродак. У краіне шмат мясцінаў, што зведалі ўмераны антрапагенны ўплыў, захавалі сваё спрадвечнае аблічча ў нязначна зменены выглядзе, а іхняя ўнікальнасць засведчана не толькі ў еўрапейскім, але і ў сусветным маштабе [8, 9]. Пра гэта ўскосна сведчыць і развіццё агратурызму на Беларусі [10], што ніяк не здольны развівацца па-за прыродным асяродкам.

Прыродныя і сацыяльна-палітычныя ўмовы Рэспублікі Беларусь спрыяюць захаванню на ейнае тэрыторыі шэрагу рэдкіх у нацыянальным і міжнародным маштабе экасістэмаў, а таксама каштоўных відаў жывёлаў і раслінаў. У краіне і цяпер захаваліся працяглыя абшары натуральных краявідаў. Сярод іх асаблівае значэнне ў захаванні біялагічнай разнастайнасці маюць поймы рэк і забалочаныя тэрыторыі. А ў выніку апошніх даследаванняў сталі відавочнымі ўнікальнасць і выключнае значэнне тэрыторыі Рэспублікі Беларусь для захавання глабальнай біялагічнай разнастайнасці [8].

Менавіта прыродны турызм атрымліваецца выключным для Рэспублікі Беларусь. Беларускія аб'екты прыроднага турызму з'яўляюцца выбітнымі на планетарным узроўні, здольныя паўсюдна выклікаць сапраўдную зацікаўленасць і матываваць турыстаў да наведвання.

Краіна ўжо размяшчае дастатковымі рэсурсамі для паспяховага развіцця прыроднага турызму, таму актуальным з'яўляецца пытанне рацыянальнага іхняга выкарыстання і прасоўвання. Што да рацыянальнага выкарыстання, то эфектыўным сродкам з'яўляецца раянаванне тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у мэтах прыроднага турызму. Мэтазгоднасць такога падыходу грунтуецца на наступных чынніках:

1. Аптымізацыя функцыяў кіравання.

2. Распрацоўка індывідуальнага падыходу да кожнага раёну з улікам уласцівых менавіта яму асаблівасцяў, патрэбаў і праблемаў.

3. Вызначэнне найбольш перспектыўных мясцовасцяў у межах раёнаў.

4. Стварэнне эфектыўнае сеткі турысцкіх маршрутаў і ўстановаў абслугоўвання турыстаў у кожным раёне.

5. Выкарыстанне дадзеных, якія атрыманыя падчас правядзення раянавання, пры прасоўванні адпаведных турысцкіх прадуктаў.

6. Паглыбленне экалагічных і эканамічных ведаў мясцовага насельніцтва ў праэкцыі на раён прыроднага турызму, у якім яны пражываюць, што садзейнічае іхняму далучэнню ў прыродаахоўную і прадпрымальніцкую дзейнасць.

7. Узаемавыгаднае памежнае і міжраённае супрацоўніцтва.

Такім чынам, рэкрэацыйны, лекава-аздараўленчы, пазнавальны, спраўны, спартовы, этнічны, рэлігійны, транзітны, адукацыйны турызм паводле аб'ектыўных чыннікаў маюць недастаткова магчымасцяў паспяховага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь пры цяперашніх умовах. Адзіным выключным і сапраўды перспектыўным відам турызму для краіны з'яўляецца прыродны. Рацыянальнае выкарыстанне і прасоўванне ягоных аб'ектаў здольнае ўжо ў кароткачасовай перспектыве прыносіць значную эканамічную карысць і спрыяць дабрабыту ўсяе нацыі.


1. Бабкин, А.В. Специальные виды туризма / А.В. Бабкин. – Ростов н/Д: Феникс, 2008. – 252 с.
2. Інтэрнэт-партал аб санаторыях Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://sanatorii.by/?setlng=by&id=main. – Дата доступу: 15.02.2010.
3. Литвинова, В. Путевки в белорусские санатории давно распроданы [Электронный ресурс] / В. Литвинова // Белорусские новости. – Режим доступа: http://naviny.by/rubrics/tourism/2009/05/27/ic_articles_126_162832/. – Дата доступа: 27.05.2009.
4. Гардзіенка, Н. Беларуская дыяспара як аб'ект гістарычнага дасьледаваньня [Электронны рэсурс] / Н. Гардзіенка // Беларускі калегіюм. – Рэжым доступу: http://baj.by/belkalehium/lekcyji/historyja/hardzijenka-n_01.htm. – Дата доступу: 17.02.2010.
5. Фэст Маці Божай Будслаўскай [Электронны рэсурс] // Наша ніва. – Рэжым доступу: http: // news.tut.by/otklik/112240.html. – Дата доступу: 03.07.2008.
6. Иностранные студенты вузов Беларуси [Электронный ресурс]// Информационно-аналитический ресурс о системе высшего образования. – Режим доступа: http://www.edubelarus.info/index.php?newsid=100. – Дата доступа: 15.02.2010.
7. Каталог высших учебных заведений Республики Беларусь: образовательные услуги для иностранных граждан. – Минск: Орех, 2007. – 164 с.
8. Казулін, А.В. Скарбы прыроды Беларусі / А.В. Казулін. – Мінск: Беларусь, 2005. – 215 с.
9. Блакітны скарб Беларусі: энцыкл. – Мінск: БелЭн, 2007. – 480 с.
10. Шелегович, О. Около 36 000 туристов в Беларуси местом отдыха выбрали агроэкоусадьбы [Электронный ресурс] / О. Шелегович // БЕЛТА. – Режим доступа: http: // news.tut.by/129207.html. – Дата доступа: 13.02.2009.


## ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ ЭКОЛОГИЧЕСКОГО ТУРИЗМА В НАЦИОНАЛЬНЫХ ПАРКАХ БЕЛАРУСИ


***Штефан Л.В., канд. геол.-минерал. наук,***
Институт туризма Белорусского государственного университета физической культуры, Республика Беларусь


В последние годы как в Беларуси, так и за рубежом все большее распространение получает экологический туризм. Именно к этому направлению относятся такие, особенно популярные среди населения виды самодеятельного туризма, как путешествия, связанные со сплавом по рекам и озерам, с любительской (спортивной) рыбной ловлей, сезонной (спортивной) охотой, сбором и заготовкой даров леса (грибов, ягод, лечебных трав), с зимними путешествиями на лыжах или снегоходах (мотонартах), с фотоохотой и др.